СВЯТЛАНА ЦІХАНОЎСКАЯ ОФІС

Аб’яднаны Пераходны Кабінет Беларусі
Прадстаўніцтва па нацыянальным адраджэнні

праект (снежань 2023)

# ДАРОЖНАЯ МАПА

падрыхтоўкі сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі
да рэфармавання
(пераходны перыяд: 50–100–500 дзён)

## ПРЭАМБУЛА

Пры падрыхтоўцы дарожнай мапы аўтары зыходзілі з таго, што рэформа адукацыі — гэта толькі частка агульных дэмакратычных змен у Беларусі, таму гэтая дарожная мапа на этапе выканання павінна быць узгодненая, у прыватнасці, з дарожнай мапай рэформаў мясцовага самакіравання і падатковай сістэмы.

Аўтарская група была сфарміраваная па ініцыятыве Офіса Святланы Ціханоўскай і пры ўдзеле Аб’яднанага пераходнага кабінета ў сувязі з падрыхтоўкай дэмакратычнымі сіламі агульнай “Стратэгіі пераходу да Новай Беларусі”. Мяркуецца, што імплементацыя дарожнай мапы стане часткай рэалізацыі дадзенай Стратэгіі.

### Візія (да чаго прывядзе рэалізацыя дарожнай мапы)

У Беларусі будзе створаная сучасная даступная для ўсіх адукацыйная сістэма, якая выкарыстоўвае навукова абгрунтаваныя падыходы і сучасныя педагагічныя тэхналогіі.

Аснову сістэмы адукацыі складуць кампетэнтныя і мэтанакіраваныя настаўнікі і кіраўнікі ўстаноў адукацыі, псіхалагічна камфортнае і бяспечнае навучальнае асяроддзе, арыентаванае на вучняў.

Сістэма адукацыі будзе грунтавацца на дэмакратычных механізмах кіравання, якія забяспечаць актыўны ўдзел у прыняцці рашэнняў усіх зацікаўленых бакоў грамадства: вучняў, іх законных прадстаўнікоў, педагогаў, мясцовай супольнасці, працадаўцаў. У выніку дзяржаўная школа стане публічнай (муніцыпальнай) і будзе перададзеная ў сістэму мясцовага самакіравання.

Будзе забяспечаны роўны доступ навучальных устаноў усіх формаў уласнасці да бюджэтнага фінансавання, пры гэтым гарантаваная свабода выбару ўстановы адукацыі бацькамі.

Дзякуючы арыентацыі на нацыянальныя інтарэсы, падтрымцы нацыянальнай мовы і культуры, а таксама інтэграцыі ў еўрапейскую і міжнародную адукацыйную прастору вучні будуць атрымліваць адукацыю, адпаведную міжнародным стандартам, і пры гэтым не страцяць сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці.

У той жа час сістэма бесперапыннай адукацыі будзе дапамагаць людзям рознага ўзросту навучацца і прафесійна развівацца на працягу ўсяго жыцця.

У выніку адукацыйная сістэма Беларусі будзе даваць вучням сістэмныя навуковыя веды, фарміраваць каштоўнасныя арыенціры і дапамагаць развіваць жыццёвыя навыкі, г. зн. будзе рыхтаваць адукаваных, кампетэнтных і адказных грамадзян, здатных адказваць на выклікі сучаснага свету і рабіць свой унёсак у развіццё грамадства.

Мэта гэтага дакумента — вызначыць канкрэтныя крокі, якія будуць зробленыя дзеля дасягнення дадзенай візіі ў першыя 50–100–500 дзён з моманту змены недэмакратычнай улады.

## Апісанне актуальнай сітуацыі ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі

Асноўнымі прычынамі кепскага становішча ў адукацыі з’яўляюцца дамінаванне ненавуковага падыходу да навучання і выкладання; неарыентаванасць адукацыі на нацыянальныя інтарэсы; ізаляванасць ад сучасных глабальных адукацыйных тэндэнцый, састарэлыя навучальныя стандарты, праграмы і методыкі; недастатковае фінансаванне і нізкія заробкі настаўнікаў;

аўтарытарны менеджмент і адсутнасць уплыву на адукацыйны працэс зацікаўленых суб’ектаў грамадства.

Адукацыя павінна не проста выводзіць моладзь на рынак працы, яна павінна сфарміраваць у вучняў ключавыя кампетэнцыі, неабходныя для самарэалізацыі, сацыялізацыі і актыўнага грамадзянства.

Гэты падыход у Беларусі сутыкаецца з шэрагам выклікаў. Школы, настаўнікі і вучні маюць залішнія функцыі і абавязкі, а сістэма кіравання часта выкарыстоўвае адміністрацыйны прымус, псіхалагічны ціск і гвалт. Змест адукацыі і навучальна-выхаваўчы працэс моцна палітызаваныя і ідэалагізаваныя. Настаўнікі часта вымушаныя граць ролю масоўкі на спартыўных і прапагандысцкіх мерапрыемствах або выконваць працу, не звязаную з іх прафесійнымі абавязкамі, напрыклад: рамонтныя работы ў школе, прымусовую працу на суботніках ці выкананне адміністрацыйных задач, якія знаходзяцца ў зоне адказнасці іншых ведамстваў і дзяржаўных органаў.

Аднак па-за гэтымі праблемамі ёсць і іншыя, звязаныя з самой структурай і функцыянаваннем сістэмы адукацыі. Школа павінна быць больш адкрытай, каб мець магчымасць гнутка і хутка рэагаваць на змены. Неабходныя механізмы ўплыву на змест адукацыі ўсіх стэйкхолдараў.

Таксама варта адзначыць, што аўтарытэт настаўніцтва як прафесійнай супольнасці падарваны нізкімі заробкамі і аўтарытарным стылем кіравання, што не спрыяе прыходу ў школу кампетэнтных і матываваных спецыялістаў. Якасць школы залежыць ад якасці настаўнікаў. А пры такім становішчы цяжка падрыхтаваць сацыяльна эфектыўных вучняў, прышчапіць ім навык адэкватнай самаацэнкі і ўпэўненасці ў сабе.

У нашай краіне сістэма адукацыі не адпавядае інтарэсам беларускага грамадства, яна не арыентаваная на рынак працы Беларусі, правакуе адток мазгоў, працоўную і палітычную эміграцыю. Акрамя таго, настаўнікі ў Беларусі ў сваёй большасці не інфармаваныя пра новыя даследаванні і тэндэнцыі ў адукацыі праз моўны бар’ер і арыентацыю Беларусі на Расію.

Праз неэфектыўны дзяржаўны менеджмент у сістэме адукацыі створаны вялікі бюракратычны апарат, які выконвае пераважна толькі функцыі кантролю. У сферы адукацыі занята 400,6 тыс. чалавек. З іх педагагічных работнікаў — толькі 198,2 тыс. (з іх настаўнікаў — 84,6 тыс.).

Такім чынам, сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь патрабуе тэрміновай рэформы, скіраванай на выпраўленне гэтых і іншых недахопаў і дысбалансаў. Рэфармаванне дазволіць стварыць сучасную і заснаваную на супрацоўніцтве ўсіх суб'ектаў адукацыі сістэму, якая будзе спрыяць развіццю ў вучняў ключавых кампетэнцый, а таксама крытычнага мыслення, творчага патэнцыялу і актыўнай жыццёвай пазіцыі.

## Базавыя прынцыпы

Навуковы падыход. Улік даследаванняў і рэкамендацый, прапісаных у дакументах ЮНЕСКА, Еўракамісіі, OECD; уласных даследаванняў, нацыянальных маніторынгаў, якія праводзяцца паводле агульнапрынятай метадалогіі; дасягненняў нейрабіялогіі, нейрадыдактыкі і іншых навук.

*Каментар: Навуковы падыход у гэтым дакуменце разглядаецца як Evidence-based learning and teaching — навучанне і выкладанне, заснаванае на фактычных дадзеных, і азначае, што рашэнні для паляпшэння навучання і выкладання павінны прымацца на аснове канкрэтных доказаў, навуковай літаратуры, эксперыментальных даследаванняў.*

*1. У педагогіцы, як і ў іншых навуках, існуюць агульнапрынятыя метады даследавання эфектаў навучання. Беларускія навукоўцы ў сваёй большасці не ведаюць навуковай тэрміналогіі, метадалогіі правядзення педагагічных даследаванняў, таму дагэтуль беларуская педагогіка не ўключана ў міжнародную навуковую прастору, а сур'ёзныя даследаванні і рэкамендацыі навукоўцаў не кладуцца ў аснову адукацыйнай палітыкі.*

*2. Адно з найбольш унікальных навуковых дасягненняў у адукацыі ў апошнія дзесяцігоддзі было зроблена дзякуючы нейранавукам і вывучэнню мозга ў сувязі з навучаннем. Яно ўключае большае разуменне нейрапластычнасці на ўсіх стадыях чалавечага*

*развіцця: функцый мозга і чалавечай нейралогіі; здольнасці памяці, апрацоўкі інфармацыі, моўнага развіцця і комплекснага мыслення; а таксама ўплыву на навучанне як станоўчых, так і адмоўных стымулаў (UNESCO, https://www.nastaunik.info/sites/default/files/page/files/unesco_bel_1.pdf ).*

**Дэмакратызацыя і дэцэнтралізацыя кіравання адукацыяй** прадугледжвае пераадоленне каманднa-адміністрацыйнага стылю кіравання, шырокае дэлегаванне паўнамоцтваў школьным радам, педагагічным і навуковым саветам, іншым грамадскім структурам і іх удзел у кіраванні дзейнасцю навучальных устаноў.

**Арыентацыя на нацыянальныя інтарэсы і пабудову дэмакратычнай беларускай дзяржавы.** Улік эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных патрэб грамадства і ўніфікацыя з еўрапейскімі стандартамі і падыходамі да ацэнкі якасці адукацыі.

## Структура дарожнай мапы

Дарожная мапа ўключае наступныя этапы:

*50 дзён*: на гэтым этапе трэба закласці дэмакратычныя механізмы і мінімізаваць магчымасць адкату назад да аўтарытарнага кіравання адукацыяй;

*100 дзён*: на гэтым этапе трэба ўзгадніць Канцэпцыю развіцця адукацыі і зрабіць першыя крокі да замацавання дэмакратычных змен;

*500 дзён*: на гэтым этапе патрабуецца прыняцце новага Закона (Кодэкса) аб адукацыі, складанне доўгатэрміновага дакладнага графіка крокаў рэформы, супрацоўніцтва з іншымі суб’ектамі.

# 50 ДЗЁН

(Этап хуткіх дзеянняў. Ліквідацыя перашкод)

На гэтым этапе трэба закласці дэмакратычныя механізмы і мінімізаваць магчымасць адкату назад да аўтарытарнага кіравання адукацыяй. Этап *50 дзён* стартуе з моманту фарміравання Урада пераходнага перыяду.

| № | Назва мерапрыемства | Адказныя / Выканаўцы | Перыяд рэалізацыі | Каментары і ўдакладненні |
|---|---|---|---|---|
| 1 | SWOT-аналіз стану адукацыі і стартавых умоў.<br>Карэкціроўка дарожнай мапы і перадача паўнамоцтваў выканаўчым структурам | Міністэрства адукацыі, Урад пераходнага перыяду з далучэннем распрацоўшчыкаў дарожнай мапы і экспертаў | першы тыдзень пасля змены ўлады | Адказныя за адукацыйны кірунак з АПК і ОСЦ ініцыююць сумесную сустрэчу-планаванне з выканаўчымі органамі ўлады (або старымі, як Міністэрства адукацыі, або часовымі, наватворанымі для пераходнага перыяду). На гэтай сустрэчы праводзіцца SWOT-аналіз і карэкціроўка дарожнай мапы з улікам стартавых умоў (наяўнасці фінансавых сродкаў, кадраў, структур і т.п.). Пасля адказнасць за рэалізацыю дарожнай мапы пераходзіць да выканаўчай структуры |
| 2 | Паступовае рэфармаванне і скарачэнне структур адукацыйнай вертыкалі (раённых, гарадскіх і абласных упраўленняў адукацыі) і перадача адказнасці за кіраванне ўстановамі адукацыі дырэктарам школ.<br>Галоўныя мэты:<br>- дэбюракратызацыя школы, вызваленне ад залішняга бюракратычнага кантролю;<br>- забеспячэнне школе статусу паўнавартаснай юрыдычнай асобы;<br>- вызваленне педагогаў ад ідэалагічнага ціску і дадатковых немэтазгодных абавязкаў | Урад пераходнага перыяду. Міністэрства адукацыі як выканаўчая ўлада да выбараў парламента і прызначэння новага Кабінета Міністраў кіруецца дарожнай мапай | 50–500 дзён | Раённыя, гарадскія і абласныя ўпраўленні адукацыі ніколі не выконвалі важных для кіравання школамі функцый. Адукацыйная вертыкаль у выглядзе ўпраўленняў па адукацыі пры выканкамах стварала ідэалагічны ціск на школы, дэматывавала ініцыятыву. Досвед устаноў адукацыі рэспубліканскага падпарадкавання, такіх як Ліцэй БДУ ці былы Гуманітарны ліцэй імя Я. Коласа і інш., пацвярджае контрпрадуктыўны характар пазначанай адукацыйнай вертыкалі.<br>Дэбюракратызацыя школы і працы педагогаў уключае скасаванне цэлага шэрага патрабаванняў і абавязкаў, напрыклад: абавязковы шосты школьны дзень, прымусовая падпіска, распаўсюд латарэй, суботнікі і зборы грошы на іх, наведванне лядовых палацаў і іншых падобных месцаў падчас навучальнага працэсу, “усенавуч”, кантроль за сем’ямі і сацыяльнымі сеткамі вучняў, заангажаванне настаўнікаў у рамонтныя работы, выбарчыя камісіі і т.п.<br>**Настаўнік будзе выконваць толькі прафесійныя абавязкі, прапісаныя ў працоўным заканадаўстве і працоўных дамовах.**<br>Санітарныя і пажарныя службы будуць узаемадзейнічаць са школамі як партнёры і памочнікі, а не як кантралёры. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | Плануецца, што пасля скасавання РУА і АблУА вызваленыя фінансавыя сродкі дазволяць вярнуць 18-гадзінную стаўку настаўніка, а найлепшыя спецыялісты гэтых структур узмоцняць кадравы склад школ, зменшаць недахоп настаўнікаў |
| 3 | Стварэнне органаў самакіравання. Стварэнне школьных рад, бацькоўскіх камітэтаў, вучнёўскага самакіравання з наданнем ім акрэсленай сферы прыняцця рашэнняў | Міністэрства адукацыі, мясцовыя органы ўлады (ці іх папярэднікі на пераходны перыяд). *Выканаўцы*: мясцовыя ўлады, дырэктары школ | 20–50 дзён | Напрыклад, рашэнне пра існаванне або неіснаванне школьнай формы ва ўстанове адукацыі прымае выключна бацькоўскі камітэт. Плануецца даць права школьнай радзе выбіраць і звальняць дырэктара школы. У Палажэнні пра школьную раду будуць прапісаныя кваліфікацыйныя патрабаванні да кандыдатуры дырэктара, перыядычнасць правядзення выбараў, напрыклад, раз на 5 гадоў. (*Пытанне: што рабіць з найбольш адыёзнымі асобамі, якія ўдзельнічалі ў рэпрэсіях, фальсіфікацыях?*) Рашэнне пра прыём або звальненне настаўнікаў прымае дырэктар школы. Пры падборы кадраў не дапускаецца дыскрымінацыі, у тым ліку па палітычных поглядах |
| 4 | Стварэнне адкрытай і празрыстай сістэмы планавання, уліку і размеркавання бюджэту адукацыйнай установы | Дырэктар установы адукацыі | 30 дзён – да канца каляндарнага года | Гадавы бюджэт школы публікуецца на сайце навучальнай установы |
| 5 | Дэпалітызацыя і дэідэалагізацыя ўстаноў адукацыі. У навучальных установах прыпыняюць дзейнасць (расфарміроўваюцца) усе рэлігійныя, а таксама створаныя дзяржавай псеўдаграмадскія арганізацыі (БРСМ, БРПА, Белая Русь, БСЖ і інш.), скасоўваецца пасада намесніка дырэктара па ваенна-патрыятычным выхаванні | Міністэрства адукацыі, дырэктары школ | 50 дзён | Забараняецца замест вучэбных і выхаваўчых заняткаў праводзіць палітызаваныя, прапагандысцкія, ваенізаваныя і рэлігійныя мерапрыемствы (ШАГ, сустрэчы з прадстаўнікамі сілавых структур), выкарыстоўваць дзяцей у агітацыйных і рэлігійных акцыях і выкладаць іх фота ў інтэрнэт без пісьмовай згоды бацькоў |
| 6 | Захады па вяртанні ва ўстановы адукацыі настаўнікаў, звольненых па палітычных матывах | Міністэрства адукацыі, дырэктары школ, школьныя рады, педагагічныя саветы, СМІ (інф. падтрымка) | 50 дзён | Ва ўзаемадзеянні з іншымі зацікаўленымі бакамі будуць вырашацца пытанні кампенсацыі, рэабілітацыі і г.д. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7 | Інфармацыйная кампанія. Арганізацыя працы “гарачай лініі” па пытаннях, якія могуць узнікнуць на першым этапе змен | Міністэрства адукацыі | 50–100 дзён | Кожны настаўнік і кіраўнік школы зможа атрымаць інфармацыйную дапамогу |
| 8 | Працяг інфармацыйнай кампаніі па вытлумачэнні асноўных кірункаў рэфармавання сістэмы адукацыі, арганізацыі самакіравання навучальных устаноў | Міністэрства адукацыі, іншыя структуры новай выканаўчай улады, дырэктары школ, грамадскія арганізацыі, СМІ | 50–100 дзён | Настаўнікі, кіраўнікі школ, бацькі, працадаўцы, органы ўлады і самакіравання, эксперты заклікаюцца да шырокай грамадскай дыскусіі і выпрацоўкі візіі новай беларускай школы. Прыцягненне СМІ, стварэнне ўласных каналаў інфармавання |

# 100 ДЗЁН

(Этап грамадскай згоды на змены)

На гэтым этапе трэба ўзгадніць Канцэпцыю развіцця адукацыі і зрабіць першыя крокі да замацавання дэмакратычных змен.

| № | Назва мерапрыемства | Адказныя / Выканаўцы | Перыяд рэаліза-цыі | Каментары і ўдакладненні |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Узгадненне і ўдакладненне Канцэпцыі рэфармавання адукацыі Беларусі.<br><br>Для гэтага ў кожнай школе арганізуецца абмеркаванне праекта Канцэпцыі рэформы адукацыі, прадстаўленай экспертамі для шырокай грамадскасці, і збіраюцца прапановы па яе ўдасканаленні | Міністэрства адукацыі, дырэктары школ, грамадскія структуры, СМІ | 50 дзён – да прынящцця Закона | Праект Канцэпцыі пачынае рыхтавацца і абмяркоўвацца з прыцягненнем як мага большага кола суб'ектаў адукацыі. На дадзеным этапе кожны зацікаўлены бок прадстаўляе свае заўвагі, якія тычацца зместу, методык, сістэмы кіравання, тэрмінаў правядзення рэформы і г.д. Мяркуецца, што настаўнікі, вучні, бацькі, працадаўцы, органы ўлады і самакіравання змогуць унесці карэктывы і прапановы, каб кожны паўплываў, прыняў і ўсвядоміў карысць і якасныя змены, якія прынясе рэформа, пераадолеў адмоўнае стаўленне да яе, ведаў графік, сваю ролю і выгаду.<br>Для настаўнікаў гэта могуць быць прафесійныя свабоды ў выбары дапаможнікаў, праграм, методыкі, падручнікаў, тэмпаў навучання, тэм і месца павышэння кваліфікацыі, прававой абароны, права на адпачынак падчас асенніх, зімніх і веснавых канікул, іншага, што будзе спрыяць стварэнню добразычлівай атмасферы ў настаўніцкіх калектывах.<br>Для працадаўцаў, бацькоў, вучняў – права ўплываць на змест адукацыі, вызначэнне профільных кірункаў |
| 2 | Органы самакіравання абвяшчаюць конкурс на пасаду дырэктараў школ.<br>Распрацоўка кандыдатамі на пасаду дырэктара школы планаў развіцця школы на бліжэйшыя 3 гады для атрымання права ўдзельнічаць у конкурсе на пасаду дырэктара | Наваствораныя органы самакіравання (у тым ліку школьнага) ці мясцовай выканаўчай улады або іх папярэднікі, дырэктары школ | 50–200 дзён | План развіцця школы — неабходны дакумент для ўдзелу ў конкурсе на пасаду дырэктара школы. Планы могуць распрацоўвацца як асабіста, так і пры ўдзеле педагагічнага савета. Гэтыя планы будуць прадстаўленыя школьным радам, і на іх падставе школьныя рады будуць прымаць рашэнне пра выбар адпаведнай кандытатуры на пасаду дырэктара школы |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3 | Падрыхтоўка адукацыйнага заканадаўства.<br>Міністэрства адукацыі і грамадскія структуры пачынаюць працу па падрыхтоўцы адукацыйнага заканадаўства, сістэмы перападрыхтоўкі настаўнікаў, распрацоўцы новых стандартаў, рамкавых праграм | Міністэрства адукацыі.<br>Міністэрства адукацыі далучае грамадскія структуры, экспертаў, замежных кансультантаў | 50–500 дзён | Праца над праектам Закона (або Кодэкса) аб адукацыі і яго грамадскае абмеркаванне. Закон распрацоўваецца на падставе Канцэпцыі новай беларускай школы |
| 4 | Аўтаномія і прафесійныя свабоды настаўнікаў.<br>Міністэрства адукацыі распрацоўвае толькі рамкавую праграму, зацвярджае стандарты і кантралюе якасць адпаведна ім | Міністэрства адукацыі | 50–500 дзён | Настаўнікі атрымліваюць поўную прафесійную свабоду: складаць вучэбныя планы, выбіраць падручнікі, метады, стратэгіі, спосабы і сродкі навучання і выхавання. Настаўнік, які не хоча ці не можа распрацаваць уласныя планы і стратэгіі, будзе выбіраць з прапанаваных Міністэрствам адукацыі, адаптаваўшы іх пад сябе і пад спецыфіку свайго вучнёўскага кантынгенту |

# 500 ДЗЁН

(Этап заканадаўчага замацавання і падтрымкі змен)

На гэтым этапе патрабуецца прыняцце новага Закона (Кодэкса) аб адукацыі, складанне доўгатэрміновага дакладнага графіка крокаў рэформы, супрацоўніцтва з іншымі суб’ектамі.

| № | Назва мерапрыемства | Адказныя / Выканаўцы | Перыяд рэалізацыі | Каментары і ўдакладненні |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Стварэнне праекта новага Закона аб адукацыі. Прадстаўленне яго ў парламент | Міністэрства адукацыі, органы і групы, якія маюць права заканадаўчай ініцыятывы | 100–500 дзён | Напісанне і прыняцце новага Закона (Кодэкса) аб адукацыі, які зацвердзіць мэту адукацыі, арыентаваную на нацыянальныя інтарэсы і дэмакратычнае развіццё, новую сістэму кіравання адукацыяй з удзелам усіх суб’ектаў грамадства, плюралізм школ; аўтаномію школ і настаўнікаў у выбары зместу і методык; арыентацыю на каштоўнасны складнік адукацыі |
| 2 | Планаванне дакладнага графіка рэформы адукацыі | Міністэрства адукацыі | 100–500 дзён | Прыблізны доўгатэрміновы графік крокаў рэформы адукацыі будзе прапанаваны Канцэпцыяй новай беларускай школы. На гэтым этапе ён будзе ўдакладняцца з улікам выдзеленых на рэформу сродкаў, наяўнасці іншых рэсурсаў і структур, новых выклікаў. Рэформа распачнецца з падрыхтоўкі настаўнікаў і інфармавання бацькоў і будзе разлічаная на 8–10 гадоў. Кожны ўдзельнік будзе ведаць свае функцыі і задачы на кожным этапе рэформы |
| 3 | Павелічэнне фінансавання сістэмы адукацыі Міністэрства адукацыі рыхтуе змены ў заканадаўства | Міністэрства адукацыі, Міністэрства фінансаў, парламент | Да прыняцця наступнага дзяржаўнага бюджэту | Будзе пралабіраванае павелічэнне артыкула бюджэту на адукацыю пажадана да 8–10% ВУП. Школы як юрыдычныя асобы атрымаюць магчымасць дафінансавання і супрацоўніцтва з міжнароднымі фондамі, якія падтрымліваюць адукацыю, запрацуе не толькі на паперы прынцып падушавога фінансавання школ, бацькі будуць мець права выбару школ, аплата працы настаўніка павялічыцца. Прапанаваць змены ў фіскальнае заканадаўства на прыкладзе Літвы і Польшчы, калі фізічныя і юрыдычныя асобы могуць накіроўваць працэнт ад падаткаў на грамадскія арганізацыі, палітычныя партыі і некамерцыйныя ўстановы (школы) |
| 4 | Аднаўленне сацыяльнага статусу настаўніка | Міністэрства адукацыі, дырэктары школ, грамадскія структуры, СМІ | 100–500 дзён | Павышэнне заробкаў настаўнікаў да сярэдніх заробкаў рэальнага сектара эканомікі, забеспячэнне прафесійных свабод, магчымасці для прафесійнага росту і развіцця, сацыяльная абарона будуць спрыяць прыцягненню ў сферу адукацыі кваліфікаваных, ініцыятыўных і адказных грамадзян |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5 | Перападрыхтоўка настаўнікаў для новай беларускай школы | Міністэрства адукацыі, грамадскія структуры | 100–500 дзён | Міністэрства адукацыі распрацоўвае графік і змест перападрыхтоўкі кадраў, грамадскія структуры таксама праводзяць курсы павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, у тым ліку моўных кампетэнцый |
| 6 | Пачатак працы над новымі падручнікамі, укараненне новых метадычных падыходаў, сістэмы ацэнкі ў масавую школу | Міністэрства адукацыі, грамадскія структуры | 100–500 дзён | На падставе раней створаных стандартаў, зацверджанай кампетэнтнаснай мадэлі беларускага вучня і распрацаваных Міністэрствам адукацыі рамкавых праграм абвяшчаюцца конкурсы на стварэнне падручнікаў, вучэбна-метадычных комплексаў, праграм па прадметах, факультатывах, перакваліфікацыі кадраў |

# ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ*

**50 дзён**. Будзе змененая недэмакратычная сістэма кіравання адукацыяй: створаныя органы самакіравання ў школах і празрыстая сістэма прыняцца рашэнняў, адбудзецца дэпалітызацыя і дэідэалагізацыя ўстаноў адукацыі. Створаныя ўмовы для вяртання настаўнікаў, звольненых па палітычных матывах. Пачатак шырокай грамадскай дыскусіі для выпрацоўкі візіі новай беларускай школы.

**100 дзён**. На дадзеным этапе будзе створаная Канцэпцыя развіцця беларускай школы з прыцягненнем усіх зацікаўленых бакоў. Распачнецца праца па стварэнні новага адукацыйнага заканадаўства: стандартаў, рамкавых праграм і г.д. Пачнецца працэс выбараў дырэктараў школ. Пашырацца прафесійныя свабоды настаўнікаў, школы атрымаюць рэальную аўтаномію.

**500 дзён**. Падрыхтаваны праект Закона аб адукацыі. Прапісаны дакладны графік рэформы сістэмы адукацыі. Распачнецца масавая перападрыхтоўка настаўнікаў. Стварэнне і ўкараненне новых метадычных падыходаў, пачатак працэсу напісання новых падручнікаў.

**У выніку чакаюцца наступныя якасныя змены:**

Зменіцца атмасфера ў школе. Ва ўмовах акадэмічнай свабоды, канкурэнтнасці, выбарнасці кіраўніцтва школ і празрыстага фінансавання настаўнік атрымае справядлівы заробак, адновіцца статус і павага да настаўніка як стваральніка будучыні.

Школа будзе фарміраваць кампетэнцыі, неабходныя для самарэалізацыі асобы, паспяховага ўзаемадзеяння з грамадствам, працаўладкавання. Каштоўнасці стануць неад’емным складнікам усяго адукацыйнага працэсу.

Новая школа будзе ўзгадоўваць беларускую ідэнтычнасць, выхоўваць адказнасць не толькі за сябе, але і за развіццё і дабрабыт супольнасці, краіны і ўсяго чалавецтва.

---

* Колькасныя крытэрыі выканання дарожнай мапы будуць вызначаныя на этапе пачатку пераходнага перыяду з улікам стартавых умоў.

Прадстаўлены праект дарожнай мапы адкрыты для максімальна шырокага грамадскага і экспертнага абмеркавання, унясення абгрунтаваных дапаўненняў і змяненняў. Рэалізацыя дадзенай мапы павінна ажыццяўляцца сумеснымі намаганнямі дэмакратычных палітычных сіл і беларускай супольнасці.